…ары ўсіх краеў, злучайцеся!
27 сьнежня 1931 г. № 312 (1566)

Чырвоная зьмена

…ран ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

Пяць дзён

IV пленум ЦК ЛКСМБ пачынае …аю …боту за 5 дзён да пачатку …вага году. Тым і характэрна ра…та пленуму, што ён павінен бу…е п…весьці вынікі работы ўсіх …ган…цый комсамолу на важней…ых участках соцыялістычнага бу…ўні…ва і вызначыць шляхі, па …іх …вінна пайсьці работа органі…цыі … барацьбе за народна-гаспа…рчы плян 1932 году—году кан…тко…га выкананьня пяцігодкі ў … гад…

Пр… 5 дзён прамысловасьць Са…цка… саюзу і БССР прыступае … выкананьня народна-гаспадарча… … пл…у 1932 году. Абрысы г. г. …ызн…аны з усёй выразнасьцю. …асьп…хова выкананьне пяцігодкі … м…гіх галінах прамысловасьці … 2 …паловай і 3 гады, разгорну…ае с…цыялістычнае спаборніцтва і …дар…тва стварылі ўсе магчымась… … д… таго, каб канчаткова завяр…ыць высунуты самою рабочаю …ляса… лёзунг: выканаць пяцігодку … 4 …ды.

Не…ходна зараз-жа наставіць …ваё… задачай—давесьці пляны 4-га …акл…нага да кожнага варштата і …ера…ючыцца на выкананьне гэ…ых …лянаў. 4-ы заключны зьяў…яец… этапам разгорнутага сталін…кага …паходу, і гэты этап трэба …рай…ці з посьпехам.

П…лнум абгаворыць пытаньне …ран…порту і ўдзел комсамолу ў ба…рацьб… за здаровы паравоз.

Т…ранспорт застаецца вузкім мес…цам … нашым соцыялістычным бу…даўн…тве. Дрэнная работа тран…спор… асабліва ў першым і другім …годз… пяцігодкі не мае яшчэ і зараз …патр…нага рэзкага пералому.

Н… транспорце неабходна карэн…ная …ерабудова работы комсамолу. Раб…та выязных рэдакцый „Чырво…най …зьмены" у Віцебску, Магілеве і Го…млі з усёй яскравасьцю пака…залі, што там, дзе дасягаецца карэн…ная …ерабудова комсамольскай рабо…ты …арам ца нізавой вытворчай …адзін…і, там, дзе сапраўды мобілізу…юць… масы чыгуначнікаў на ажыць…цяў…леньне ўказаньняў т. Сталіна і …вага… т. Андрэева, там забясьпеч…ваец… пералом, там транспорт пе…рах…одзіць на пераможныя рэйкі.

…Ў колгасным будаўніцтве на да…ны… этапе партыя вызначыла ас…ноўную задачу—організацыйнае за…замацаваньне колгасаў. Вялікая ра…бота праведзена комсамолам у гэтай галіне, але яшчэ большая і адказь…нейшая павінна быць у далейшым.

Конкурс „Праўды" на організацыйнае замацаваньне колгасаў павінен знайсьці ў ленінскім комсамоле аднаго з актыўнейшых барацьбітоў.

Вялікіх перамог мы дабіліся сёлета ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва і асабліва школьнага.

Мы ахапілі школай першага концэнтру 658400 чал. і 109 тысяч школамі другога концэнтру. Мы значна павялічылі сетку сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў. Мы павінны і станем у 1932 г. краінай суцэльнай пісьменнасьці.

Але якасьць школьнай работы яшчэ нізкая. Разрыў паміж тэорыяй і практыкай не ліквідаваны. Комсамол абавязкі шэфа выконвае слаба.

Год выкананьня пяцігодкі—год канчатковай ліквідацыі спадчыны мінулага—няпісьменнасьці. Пленум павінен і на гэтым вучастку падвесьці вынікі працы ЛКСМБ і вызначыць шляхі нашай далейшай работы.

Асаблівая ўвага павінна быць зараз зьвернута на выхаваньне новага актыву, на такое кіраўніцтва комсамольскай організацыяй, каб забясьпечыць штодзённай увагай і дапамогай кожную ўдарную гаспадарча-разрахунковую брыгаду паасобку, каб наладзіць канкрэтнае дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва.

У дні ўсесаюзнага сталінскага паходу комсамол упарта змагаецца за рэалізацыю ўказаньняў т. Сталіна. Занесеныя на ганаровы сьпіс „Чырвонай зьмены" брыгады і камуны—перадавікі з тых соцень і тысяч, якія змагаюцца за пляны 3-га рашаючага.

Падвесьці вынікі нашай работы, вызначыць нашы бліжэйшыя шляхі ў выкананьні народна-гаспадарчага пляну 1932 году, у рэалізацыі ўказаньняў т. Сталіна, каб прынесьці конкрэтныя рапарты нашых баявых перамог 17 усесаюзнаму і 14 усебеларускаму зьездам партыі.

Паведамленьне ТАСС

2… сьнежня супрацоўнік НКШЗ гр-н Г. зьвярнуўся ў колегію АДПУ з за…ай, у якой ён паведаміў на…ступ…е: На працягу 3-х з лішнім год… быў знаёмы з членам аднэй чуж…емнай місіі ў Маскве, з якім ран… падтрымліваў знаёмства на глебе … …льных антыкварных інтарэсаў. Пас…пова, аднак, азначаны член чужаземнай місіі стаў атрымліваць ад … на Г. весткі адносна становішча … чыгунак СССР і ў прыватнасьці весі… аб пабудовах новых чыгунак.

У … пачатку сьнежня па ініцыятыве член… місіі гутаркі сталі ісьці выклю…а вакол пытаньня аб падзеях у М…чжурыі. У аднэй з такіх гутарак … р-ну Г. быў зроблен намёк на тое, … што „калі-б у Маскве здарыўся зама… на японскага пасла ў СССР, дык… эта абавязкова выклікала-б вайну пам… СССР і Японіяй". З прычыны таго, … што гр-н Г. адразу не рэагаваў на … гэты намёк, член чужаземнай місіі пра… некалькі дзён аднавіў сваю гутар… аб конфлікце на Далёкім Усх…дзе і потым ужо проста пачаў пер…конваць гр-на Г., „што замах на япо…скага пасла быў-бы вялікаю спр…вай" і што гр-н Г. „мог-бы ўзяць на … сябе організацыю замаху". Пры далейшых спатканьнях член місіі,—як … заяўляе гр-н Г.,—настойліва па…ясьняў, што гэты замах неабходна зраб…іць і што ён будзе мець чыста дэм…нстрацыйны характар. Ён гавар…у, што справа ня ў тым, каб абавяз…ва забіць пасла, а досыць „дзьвюх куль з іржавага нагана ў шыбу японскага консульскага аўтомабіля на вуліцах Масквы".

Настойлівасьць, праяўленая зазначаным членам чужаземнай місіі ў гэтым пытаньні, прымусіла гр-на Г. зразумець, якая авантура задумляецца супроць Савецкага саюзу. Гр-н Г. заяўляе, што ён зразумеў, „на якую страшэнную ролю провокатара вайны хацеў яго скарыстаць яго „субяседнік". „З прычыны гэтага,—заяўляе гр-н Г.,—парашыў падаць ДПУ гэтую сваю заяву. Я хацеў-бы выкупіць тую цяжкую віну, якую я зрабіў, будучы ўцягнутым па сваёй нявопытнасьці ў падобную брудную і ганебную работу супроць маёй бацькаўшчыны".

Атрымаўшы паведамленьне з паказанымі вышэй весткамі аб дзейнасьці члена чужаземнай місіі аб праверцы некаторых даных у заяве гр-на Г., Народны Камісарыят Замежных Спраў паставіў патрабаваньне кіраўніку місіі аб тым, каб названы супрацоўнік у найкарацейшы тэрмін быў адклікан з СССР, паколькі ён у якасьці асобы, што карыстаецца дыплёматычнай недатыкальнасьцю ня можа быць судзімы ў Савецкім Саюзе.

Патрабаваньне НК Замежных спраў аб ад'езьдзе супрацоўніка місіі задаволена.

У дні марксысцка-ленінскага паходу

Да 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ

Шматмільённаму комсамолу узброены марксысцка-ленінскай тэорыяй актыў

Дабіцца пагалоўнага ахопу вучобай актыву, пачынаючы ад ячэйкі і канчаючы раённым камітэтам

Падхапіць і множыць вопыт Віцебскага гаркому комсамолу

Перад намі пастаўлена задача: узьняць на высокую ступень якасьць нашай работы. Тым больш гэта патрэбна ва ўмовах павышэньня ўдзельнай вагі моладзі на вытворчасьці і пасьпяховага вырашэньня лёзунгу аб шматмільённым комсамоле.

На каго, як не на актыў у першую чаргу ўскладзены гэтыя задачы? Адсюль—просты абавязак актыву—„вывучыць і асвоіць вопыт работы нашай партыі ў масах, вопыт організацыі мас, а гэта значыць асвоіць тэорэтычна і практычна марксысцка-ленінскае вучэньне, вывучыць і асвоіць гістарычныя традыцыі бальшавіцкай партыі".

Бязумоўна, комсамольскі актыў ідэйна і тэорэтычна ўзрос. Аднак, сёньнешнія задачы і ўзросшыя запатрабаваньні, якія прад'яўляюцца актыву—кіраўніцтву нашай організацыі, пытаньні павышэньня яго тэорэтычнага ўзроўню высоўваюцца ўсё з большай вастрынёю.

Няма асаблівай патрэбы даводзіць неабходнасьць неадкладнага тэорэтычнага ўзбраеньня нашага актыву. Даволі прывесьці прыклады, аб якіх гавораць самі актывісты. Так т. Лосеў (член бюро камітэту цэгі Віцебску) расказвае: „—у нас вельмі часта бываюць выпадкі, калі актыў, з-за сваёй нявысокай палітычнай адукацыі, ня можа як сьлед разьбіць шкодныя клясава-чужыя настроі, якія часам праяўляюцца ў цэхах". На жаль гэта мае месца. Тут мала аднэй клясавай пільнасьці. Каб разьбіць шкодныя настроі, трэба быць тэорэтычна падрыхтаваным.

Тым часам яшчэ ня мала актывістых недаацэньваюць ролі тэорэтычнай вучобы. Характэрным тут зьяўляецца тое, што, калі актывісты гавораць аб вучобе дык як быццам стаіць за яе ўсёй „душой і адданасьцю", з пенай на губах абараняе неабходнасьць вучобы, а пасьля... ўсё па-старому.

Тав. Левін—сэкратар Віцебскага Гаркому ЛКСМБ—заяўляе, што большасьць актывістых організацыі не ўсьвядомілі неабходнасьці вучыцца, і ня вучыцца. „І зусім ня дзіва, што шмат хто з актывістых,—гаворыць загадчык оргаддзелу Гаркому т. Захараў—не разумее яшчэ з усёй паўнатою, ня можа давесьці і тэорэтычна выкрыць твар трацкісцкага контрабандыстага Слуцкага".

Гэтыя факты мы ня думаем абагульваць. Ёсьць ня мала фактаў, калі актывісты ўпарта дамагаюцца аўладаць марксысцка-ленінскай тэорыяй.

Аднак, у Віцебскай організацыі недапушчальнае становішча з вучобай актыву. На першы погляд здаецца, што ўсе актывістыя ахоплены рознымі формамі вучобы (вячэрні комвуз, партшколы і г. д.), але на праверку выходзіць, што ў большасьці гэта формальны запіс. Тав. Шапіра (загадчык аддзелу культуры і адукацыі Віцебскага Гаркому) прызнаецца, напрыклад што дрэнна наведваў Комвуз, прапусьціў каля $^1/_3$ часткі заняткаў.

Тое-ж мы чулі і ад іншых таварышоў. Зараз гэтае пытаньне абмеркавана на бюро гаркому і вырашана організаваць спэцыяльную школу для вучобы актыву пры гаркоме комсамолу.

Першыя заняткі адбыліся 20 сьнежня. Зьявілася 20 чал., у большасьці—члены бюро гаркому, сэкратары камітэтаў і колектываў.

На гэтых занятках разьбіралі перадавы артыкул „Праўды" аб марксысцка-ленінскім выхаваньні ў комсамоле.

Надалей уводзіцца такі мэтод: загадзя даецца тэма ўсім слухачом двум альбо тром з іх даручаецца падрыхтаваць даклады па асобных пытаньнях тэмы, пасьля іх дакладу ўсе павінны ўдзельнічаць у спрэчках.

Мы ня думаем асабліва абараняць гэтую форму, але справа ў тым, што Віцебскі гарком першы прыняў конкрэтныя захады і сур'ёзна заняўся пытаньнем вучобы актыву. Гэта, бязумоўна, павінна паслужыць прыкладам для ўсіх організацый, у першую чаргу такіх, як Менская, Гомельская.

У далейшым бюро гаркому будзе заслухоўваць інформацыю паасобных сэкратароў камітэтаў, колектываў, членаў бюро аб іх вучобе.

Гэты першы вопыт Віцебскай організацыі, павінен быць падхоплены ўсімі організацыямі.

Выходзячы з конкрэтных умоў і абставін павінны быць выпрацаваны новыя, больш карысныя формы якія-б дапамаглі актыву як найлепш паставіць аўладаньне марксысцка-ленінскімі ведамі.

Марксысцка - ленінская вучоба актыву—важнейшая задача саюзу.

Кожная комсамольская організацыя павінна праявіць тут удумлівасьць і клопаты аб вучобе паасобнага актывістага. Вучоба актыву павінна мець у сабе тое новае чым характэрны сучасныя абставіны і задачы, якія высоўваюцца партыяй перад комсамолам.

Г. Фіялкін.



Заняткі комсамольскага політгуртка ў колгасе „Комінтэрн".

Слова актыву

Паседжаньні і сходы не павінны перашкодзіць вучобе

Я комсамолец з 1923 году г. З часу наступленьня ў комсамол я нідзе сыстэматычна ня вучыўся. Гэта бязумоўна, перашкаджае ў рабоце, асабліва на рабоце загадчыка аддзелу культуры і адукацыі, бо як раз культуры і адукацыі мне не хапае.

Політычнай вучобай я ўсё-ж займаўся і займаюся з году ў год. Я скончыў вячэрнюю 2-х гадовую саўпартшколу і першы курс вячэрняга комвузу. Зараз я вучуся на 2-м курсе вячэрняга комвузу. Аднак вучобе перашкаджае рад камандыровак і паседжаньняў, якія супадаюць з днямі вучобы ў комвузе. У выніку я прапусьціў прыблізна адну трэць усіх лекцый.

На вялікі жаль, і бюро гаркому ў дні вучобы склікае розныя паседжаньні. Нагвац упушчанае дома зусім немагчыма з-за адсутнасьці часу. Позна ўночы прыходзіш дамоў і ледзь пасьпяваеш прачытваць газэту. Выхадных дзён за апошнія 6 месяцаў я меў 4-5.

У далейшым неабходна адносіцца да політычных заняткаў так, як і да вайсковых. Гэта значыць лічыць наведваньне бязумоўна абавязковым і катэгорычна не дапускаць у гэтыя дні ніякіх паседжаньняў, якія-б перашкодзілі вучобе.

Акрама сталай вучобы неабходна організоўваць абмен думкамі актыву па асобных пытаньнях бягучай політыкі і па газэтным матар'яле.

Вельмі важна для кіруючага актыву быць знаёмым з важнейшымі творамі пролетарскай літаратуры Савецкага Саюзу і Ўсходу. Гэта справа ў нас часта недаацэньваецца. У кожную вольную хвіліну наш актывісты чытае выпадковую, а часам непатрэбную літаратуру. Неабходна распаўсюдзіць сярод актыву рэкомэндацыйны сьпіс пролетарскае літаратуры. Актыву неабходна заняцца вывучэньнем твораў Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

Таксама патрэбна вывучаць замежныя мовы (нямецкую, ангельскую), як для інтэрнацыянальнай сувязі, так і для азнаямленьня з важнейшай тэхнічнай літаратурай.

Каб забясьпечыць посьпех ва ўсім гэтым, неабходна рацыяналізаваць час кожнага актывістага.

ШАПІРА

***

У Менскім індустрыяльна-пэдагогічным тэхнікуме політвучоба разгорнута як належыць. Колектыў комсамолу організаваў 9 політгуртоў, якія працуюць рэгулярна.

Усе комсамольцы і вялікая колькасьць беспартыйнага студэнцтва наведваюць гэтыя гурткі.

Акрамя гэтага, комсамольскі колектыў вылучыў групу комсамольцаў для дапамогі вытворчым ячэйкам.

Лайхтман.

Перагружанасьць—перашкаджае вучобе

На сучасным этапе кіраўніцтва ў комсамольскай організацыі актыў бязумоўна павінен надзвычай уважліва адносіцца да павышэньня свайго тэорэтычнага ўзроўню, асабліва на такім вучастку працы, як кіраўніцтва політвучобай. Шмат увагі і часу трэба аддаць на самападрыхтоўку.

Я сам скончыў раённую партшколу-перасоўку ў 1927 годзе, курсы акруговых пропагандыстых у 1928 г. і з таго часу штогод вучыўся ў партсетцы актыву.

У гэтым годзе працуючы ў гаркоме, я ня маю магчымасьці нават наведваць вячэрні комвуз з-за перагружанасьці. Але самападрыхтоўкай займаюся—вучуся ў гуртку пры гаркоме. Працую ў парадку самаадукацыі над усімі пытаньнямі бягучай політыкі. Чытаю мастацкую літаратуру.

Аднак гэтага вельмі мала. Актыў павінен стала працаваць над вывучэньнем твораў Маркса, Леніна Сталіна, адначасова вывучаючы і пытаньні бягучай політыкі.

Заг. АПТУ Віцебскага гаркому—
ЦЫРЛІН



Комсамол—шэф усеабучу

Дамо ўсеабучу пэдкадры!

Да 1 студзеня завяршыць мобілізацыю 1280 комсамольцаў на фронт усеабучу

ЛКСМБ павінен быў мобілізаваць у восеньскі набор тысячу комсамольцаў у падустановы. Аднак, большасьць комсамольскіх організацый ганебна правалілі гэтую мобілізацыю.

Комсамол павінен даць усеабучу пэдкадры.

Комсамол павінен ліквідаваць сваю запазычанасьць перад усеабучам. Неадкладна завяршыць мобілізацыю „1000". Да 1 студзеня 1932 г. мобілізаваць 280 комсамольцаў на падработу, 50 на інструктарскую работу і 30 комсамольцаў на работу ў органы нарасьветы, гэтага патрабуе навучальны год, гэтага патрабуе усеабуч.

Невыкананьне райкомамі дырэктыў ЦК будзе сьведчыць аб іх няздольнасьці ажыцьцяўляць абавязкі шэфа ўсеабучу.

Па-баявому правядзем мобілізацыю

ЦК УсеКП(б) у сваіх рашэньнях аб сярэдняй і пачатковай школе вызначыў асноўныя шляхі перабудовы школы на політэхнічнай аснове паставіўшы галоўнай задачай—палепшаньне якасьці навучаньня.

Усебеларуская нарада загадчыкаў аддзелаў культуры і адукацыі пры ЦК ЛКСМБ, якая нядаўна адбылася, з усёй вастрынёй паставіла пытаньне, што выкананьне пастановы ЦК аб школе праходзіць нездавальняюча.

Галоўны недахоп у тым, што мясцовыя комсамольскія організацыі не паставілі ў цэнтр сваёй увагі пытаньне якаснага палепшаньня работы школ, справу організацыі ўнутрышкольнай работы, справу дапамогі органам нарасьветы і настаўніцтву ў пастаноўцы мэтодычнай работы.

Школа недастаткова забясьпечана настаўніцкімі кадрамі. Пры той разгорнутай рабоце, якую мы праводзім па ўсеабучу, БССР не хапае больш 1000 настаўнікаў. Адказнасьць за гэты прарыў нясуць ня толькі органы нарасьветы, але і комсамольскія організацыі.

ЛКСМБ павінен быў мобілізаваць 1000 комсамольцаў у пэдагогічныя ўстановы. Аднак, з-за опортуністычнай позыцыі большасьці РК, замест 1000—мобілізавана толькі 250 чал. Менскі, Віцебскі, Гомельскі, Бярэзінскі, Копыльскі, Узьдзенскі, Любаньскі, Смалявіцкі, Асіповіцкі, Стара-Дарожскі і Глускі РК ЛКСМБ не выканалі заданьня ЦК аб мобілізацыі комсамольцаў у падустановы.

Сакратарыят ЦК ЛКСМБ, адзначыўшы буйнейшы прарыў у справе мобілізацыі „1000", рашуча абавязаў усе камітэты не пазьней 1 студзеня 1932 г. забясьпечыць поўнае выкананьне пастановы ЦК аб мобілізацыі.

Мобілізацыя павінна быць скончана не пазьней 1 студзеня 32 г. з такім разьлікам, каб з 5 студзеня разгарнуць работу месячных курсаў па падрыхтоўцы ўсіх мобілізаваных.

Ф. Гольман.

Неадкладна выканаць разьвёрстку!

Капцевічы. Комсамольцы колектыву заводу „Зьвязда" (Петрыкоўскі раён) пытаньнем мобілізацыі комсамольцаў у падустановы не займаўся. Петрыкоўскім райкомам была дана разьвёрстка для мобілізацыі 15 чал. на падкурсы. Але да гэтага часу комсамольскі колектыў ня выканаў гэтага заданьня.

Колектыву неадкладна трэба ўзяцца за выкананьне важнейшай пастановы ЦК ЛКСМБ.

Зубасты Грышка.

* * *

Бягомль. Справа мобілізацыі „1000" комсамольцаў у падустановы Бягомскага райкому ЛКСМБ была і не датычыцца. Райком не задумаўся нат тым, каб даць комсамольцаў у пэдустановы, нягледзячы на тое, што ў самім раёне некаторыя школы не забясьпечаны настаўнікамі.

Пара з такімі адносінамі пакончыць.

П. А. П.

Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 4 год пяцігодк

З дакладу старшыні СНК т. ГАЛАДЗЕДА на II сэсіі ЦВК БССР X скліканьня

(Канец. Пачатак гл. у № 295)

Ня спыняючыся спэцыяльна на задачах разьвіцьця іншых відаў жывёлагадоўлі, я толькі падкрэсьлю, што нам трэба налегчы на разьвіцьцё іншай дробнай хуткасьпелай жывёлы, як трусы, птушкі і г. д. Гэта ў значнай меры і ў хуткім часе вырашыць задачу мясазабясьпечаньня.

Пытаньню палепшаньня гарадзкой і жыльлёвай гаспадаркі мы дагэтуль не аддавалі належнай увагі, якое заслугоўвае гэтая галіна народнай гаспадаркі. У апошнія часы як вы ведаеце, была спэцыяльная пастанова пленуму ЦК УсеКП(б) аб наладжаньні комунальнай гаспадаркі з мэтай палепшаньня абслугоўваньня бытавых і жыльлёвых патрэб рабочае клясы.

Грунтуючыся на гэтых дырэктывах, мы запроэктавалі павышаную праграму па камунальнаму і жыльлёваму будаўніцтву, намячаючы капітальныя ўкладаньні ў жыльлёвае будаўніцтва ў разьмеры 41640 тыс. руб.—прырост супроць 1931 г. на 45,1 проц. і па комунальных прадпрыемствах у суме 31699 тыс. руб.—рост на 215, 6 проц.

Трэба пабудаваць ня менш 480 тыс. кв. м. жылой плошчы г. зн. павялічыць жыльлёвае будаўніцтва супроць 1931 г. на 140 проц. Задача нялёгкая, але яе трэба выканаць, прыцягваючы ўсю ўвагу гарадзкіх саветаў, профсаюзных і партыйных організацый, органаў жыльлёвай коопэрацыі на мобілізацыю ўсіх мясцовых рэсурсаў.

Па транспорце і сувязі вызначаны наступныя проэктаваньні. Укладаньні ў дарожнае будаўніцтва павялічваюцца на 19,4 проц. Завоз аўтомашын у БССР проэктуецца у 2750 шт. Капітальныя ўкладаньні ў аўтогаспадарку —у 23650 тыс. руб., а ў водны транспорт—у разьмеры 13777 тыс. руб,— рост на 156,2 проц. Грузазварот па водным транспорце вызначаецца ў аб'ёме 1160 тыс. тон—рост у 145,4 проц.

Па сувязі капітальныя ўкладаньні запроэктаваны ў разьмеры 138158 тыс. руб. з прыростам на 111,4 проц. супроць 1931 г.

Таваразвароту і забясьпечаньню мы надаем значны размах. Раздробны таваразварот у 1932 г. павялічваем на 42,2 проц., прычым асноўнае павялічэньне дробнага таваразвароту пойдзе па лініі закрытых рабочых і ваенных коопэратываў (194,7 проц.).

Задача палепшаньня забясьпечаньня рабочай клясы ў 1932 г. застаецца галоўнейшай. Таму мы надаем вялікую ўвагу разьвіцьцю савецкага гандлю, пашырэньню гандлёвай сеткі і самазагатовак, а таксама мобілізацыі мясцовых коопэратыўных рэсурсаў.

Мы павінны ў бліжэйшы час разгарнуць значную колькасьць савецкіх крам у рабочых населішчах у раённых цэнтрах, каб тым самым палепшыць справу забясьпечаньня. Трэба шляхам павялічэньня самазагатовак ЗРК, ЗВК, ТПО і іншых коопэратыўных організацый дабіцца павялічэньня таваразвароту за лік мобілізацыі мясцовых рэсурсаў.

Наш размах у галіне падрыхтоўкі кадраў характарызуецца павялічэньнем капітальных укладаньняў у гэту галіну з 23,3 млн. руб. у 1931 г. да 42,5 млн. руб. на 1932 г. Справу падрыхтоўкі кадраў мы ставім, як адну з галоўных.

Па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы таксама проэктуецца значны рост асыгнаваньняў. Мы мяркуем давесьці сетку фабзавучаў і аналёгічных школ да 234 адзінак—прырост на 312 проц. а колькасьць вучняў у іх павялічыць на 73,6 проц. Прычым у 1931 годзе выпуск фабзавучаў вызначаем у 6.265 чал, і з курсаў сярэдняй кваліфікацыі,—26.697 чал., а праз масавыя курсы—да 102.300 чал.

Па культурных-соцыяльных мерапрыемствах я абмяжуюся толькі агульнымі лічбамі. Галоўную задачу—увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе 4-х годкі—мы ў асноўным вырашылі ў 1931 г. У 1932 г. мы павінны дабіцца далейшага паглыбленага вырашэньня гэтай задачы і напэўна павінны ўжо будзем паставіць задачу правядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе 7-годкі.

У гэтым напрамку мы і проэктуем адпаведныя мерапрыемствы па адкрыцьцю пятых груп з мэтай ахапіць скончыўшых 4-х годку ўжо ў гэтым годзе.

Лік вучняў у першым концэнтрымы думаем давесьці да 695.800 чал. павялічэньне на 3,6 проц. у другім—концэнтры—да 186.181 чал.—павялічэньне на 70,8 проц.

Вялікія мерапрыемствы проэктуюцца і па лініі дашкольнага выхаваньня (сады, ачагі і г. д.) і організацыі пляцовак.

У адпаведнасьці з запроэктаванымі кантрольнымі лічбамі народнай гаспадаркі і культуры на 1932 г. мы склалі і фінансавы плян, які павінен забясьпечыць ажыцьцяўленьне паказаных мерапрыемстваў. Фінансавы плян вызначаецца ў разьмеры 788,1 млн. р. Дзяржаўны бюджэт мы запроэктавалі з прыростам на 72,8 проц. з давядзеньнем яго аб'ёму да 300 млн. рублёў. Па мясцовых бюджэтах мы запроэктавалі рост на 47,7 проц. з давядзеньнем іх аб'ёму да 204 млн. р.

Спыняючыся на важнейшых бягучых гаспадарчых задачах, трэба адзначыць, што справа выкананьня бягучых гаспадарчых кампаній, з-б не ска

заў, што стаіць добра. Тэрміны, устаноўленыя для сканчэньня збожжазагатовак, ужо прайшлі, а выканалі плян збожжазагатовак (без звароту насенных пазык і без памольнага збору) усяго ў разьмеры 75,3 проц. да саюзнага пляну і на 66,3 проц. нашага пляну, які мы вызначылі ў парадку сустрэчнага.

„Праўда" ня раз пісала, што Беларусь па збожжазагатоўках цягнецца ў абозе самых адсталых раёнаў. Тым больш сорамна, што ў нас па сутнасьці невялікі плян збожжазагатовак —усяго якіх-небудзь 11 млн. пуд. А вы ведаеце, што гэты плян не забясьпечвае Беларусі хлебам. Нам прыходзіцца завозіць яго з-за межаў БССР Савецкі Саюз ідзе на тое, каб хлеба да нас прывозіць, але дрэнна гаварыць аб яго прывозе ў Беларусь тады, калі мы свайго пляну ня выконваем. Мы ня можам цярпець такога становішча, каб БССР па збожжазагатоўках цягнулася ў хвасьце іншых раёнаў Савецкага Саюзу.

З загатоўкай і вывазкай дроў мы ідзем недапушчальна марудным тэмпамі. Вывазка дроў складае ўсяго 11,6 проц. пляну. У школах і больніцах топяць нерэгулярна, а побач з гэтым усе нашы тэлеграфныя загады раёнам узмацніць вывазку дроў застаюцца „гласом вопиющего в пустыне". Мы ня можам цярпець далей такога становішча.

***

З тых фактаў і лічбаў, якія я падаў, выразна відаць, што мы дабіліся гіганцкіх посьпехаў у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Пролетарыят узмацніў свае клясавыя позыцыі. У той-жа час мы бачым што на паасобных вучастках нашай работы ёсьць і значныя недахопы і нават прарывы. Аб гэтым мы павінны адкрыта заявіць для таго, каб ўлічыўшы ўрокі дрэннай работы на паасобных вучастках, не дапускаць іх паўтарэньня ў 1932 г.

У 1931 г. мы дабіліся значнага ўздыму ва ўсіх рашаючых галінах народнай гаспадаркі. Дзякуючы таму, што БССР у гэтым годзе вышла з вялікім прыростам супроць 1930 г. мы змаглі плян заключнага—чацьвертага году пяцігодкі пабудаваць, выходзячы з асноўнага лёзунгу—выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Далейшая рашучая барацьба за генэральную лінію партыі, барацьба на два фронты—супроць правых і „левых" опортуністаў і прымірэнцаў да іх—забясьпечыць выкананьне народна-гаспадарчага пляну чацьвертага, завяршаючага году пяцігодкі.

(Апладысмэнты).

К 1-му студзеня скончыць падрыхтоўк

ПЛЯН

правядзеньня стралковага паходу і конкурсу ЛКСМБ

Парадак правядзеньня: Паход і конкурс праводзяцца з 1-га сьнежня 1931 году па 31 мая 1932 г. (згодна пастановы ЦК УсеЛКСМ і ЦС АСО). Паход і конкурс падзяляюцца на 3 маршруты.

Маршрут 1-шы—падрыхтоўчы:

а) Па ўсіх ячэйках комсамолу і асоавіяхіму да 20 сьнежня прапрацаваць ліст УсеЛКСМ і ЦС АСО СССР (надрукаваны ў „Комсамольскай праўдзе" ад 24 лістапада).

б) Праверыць стан хаваньня і эксплёатацыі зброі і вучэбна-дапаможных організацыямі Асоавіяхіму ў ячэйках, вучэбна-стралковых адзінках і стралковых гуртках на 1—I-1932 г. Вайсковаму аддзелу ЦК ЛКСМБ і ЦС ОА да 25—XII г. г. накіраваць у раёны да комсамольскага сьпісу не менш 8 інструктароў для праверкі падрыхтоўкі да курсу і правядзеньня 1-га маршруту.

в) Замацаваць зброю за групамі, якія рыхтуюцца да конкурсу, бліжэй да прафорганізацый адлічыць 16 проц. на вайсковую работу дапамогі ў правядзеньні конкурсу, таксама правесьці ўсебеларускі суботнік на карысьць конкурсу да 10 студзеня 1932 г., згодна пастановы вайсковай нарады пры ЦК ЛКСМБ і ЦС ОА.

г) Стралковаму сэктару ЦС ОА не пазьней 1—II-32 г. накіраваць у раёны дробнакаліберныя патроны з тым, каб забясьпечыць выкананьне кантрольных лічбаў па конкурсу, адначасова скарыстаць наяўныя запасы патронаў у райсаветах.

е) Стварыць пры курсах і перападрыхтоўцы інструктароў стралковых гурткоў і курсаў. Менскаму, Віцебскаму, Гомельскаму, Магілёўскаму, Бабруйскаму, Аршанскаму, Барысаўскаму, Мазырскаму, Рэчыцкаму, Полацкаму і Слуцкаму райсаветам організаваць акрамя гарадзкіх курсаў перасовачныя школы для правядзеньня конкурсу ў сельскіх раёнах.

Адбор комсамольцаў для ўдзелу ў конкурсе зравесьці да 1—II-32 г.

Маршрут 2-гі конкурсу:

Праграма:

а) Апрацоўка стралкоў пірвой клясыфікацыі праводзіцца па выстынаму практыкаваньню д-к вінтоўка, прыцэл любы, адлегласьць 25 мэтраў, мішэнь № 6, колькасьць патронаў — 10 г. якіх 3 пробныя цэлі ў агульны лік, становішча для стральбы — лежачы з рукі, скарыстоўваючы земляныя равеньне, час не абмежаваны, ацэнка выніку — колькасьць ачкоў.

Для 1-е клясы патрэбна не менш як 48 ачкоў з 50 магчымых
„ 2 „ „ „ „ 45 „ „ 50 „

б) Апрацоўка стралкоў палявой клясыфікацыі на д-к вінтоўцы праводзіцца па наступнаму практыкаваньню: д-к вінтоўка любога гатунку, прыцэл любы. Практыкаваньне складаецца з трох момантаў стральбы: 1-шы — адлегласьць 50 м., час — дзесяць хвілін, патронаў 10 (пасьля 3-х пробных), мішэнь № 6 з; 2-гі — адлегласьць 100 мэтраў, 10 хв. 10 патронаў (пасьля 3-х пробных), мішэнь № 7-а, лежачы з рукі; 3-ці стральба на хуткасьць — 50 мэтраў, 1,5 хв. патронаў 10, мішэнь №7, лежачы са стаўкі, лажыцца па сыгналу „агонь".

Для атрыманьня тэй ці іншай ступені неабходна:

Для 1-й ступені — ня менш 135 ачкоў з 150 магчымых
„ 2 „ „ „ 125 „ „ 150 „
„ 3 „ „ „ 115 „ „ 150 „

Конкурс пачаць з 15-II па 1-е мая 1932 г.

Парадак правядзеньня конкурсу:

Для правядзеньня паходу і конкурсу пры ўсіх райкомах і райсаветах ствараюцца штабы з прадстаўнікоў ЛКСМБ Асоавіяхіму, васвеДу, профсаюзу і фізкульт організацый.

Паход-конкурс праводзіцца на вучэбных пунктах, у вучэбна-стралковых адзінках, стралковых гуртках, на прадпрыемствах, у саўгасах, колгасах, МТС і між імі, на падставе заключаных умоў на соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

2. Міжраённае спаборніцтва на колькасныя і якасныя паказчыкі праводзіцца згодна заключаных соц. умоў. Для правядзеньня гэтага віду конкурсу складаюцца міжраённыя штабы, у склад якіх уваходзяць па 2 прадстаўнікі ад раёнаў і 1 прадстаўнік цэнтральнага штабу.

3. Пяршынства ўстанаўляецца па выніках стральбы з улікам колькасьці і якасьці падрыхтаваных клясна-стралкоў.

Увага: інструктароў у прапорцыянальных адносінах да кантрольных лічбаў ахопу комсамольцаў па лініі ОА і па колькасьці створаных вучпунктаў і ступені абсталяваньня,

Маршрут 3-ці—Усебеларускае спаборніцтва:

Правесьці з 15 красавіка да 10-га мая ўсебеларускае спаборніцтва і з 10-га па 31-га мая—ўсесаюзнае (падстава: ліст ЦК УсеЛКСМ і ЦС ОА СССР).

1. Да 10-га мая па ўсіх раёнах БССР падагуліць штабамі вынікі і даслаць у цэнтральны штаб.

2. Вылучыць і прэміяваць лепшых стралкоў у раёнах, а таксама прадставіць для прэміяваньня Усебеларускім штабам лепшых стралкоў для чаго пры ўсіх раёнах і ў цэнтры стварыць спэцыяльны фонд для прэміяваньня.

3. Правесьці раённыя стралковыя конфэрэнцыі, на якіх популярызаваць вынікі стралковага конкурсу.

4. Раённыя штабы павінны інформаваць цэнтральны штаб 1-га чысла кожнага месяца.

5. Для ўдзелу ва ўсесаюзных спаборніцтвах адабраць лепшых стралкоў і інструктароў.

Цэнтральны штаб пры ЦС ОА БССР.

Заг. Вайсковага аддзелу ЦК ЛКСМБ Гузікаў

Нач. Вайсковага адд. ЦС ОА БССР Ратабыльскі

Менск—13-га сьнежня 1931 г.

У дні ўсесаюзнага сталінскага

Рушым лавы комсамольскія

Да 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ

у бой за няспынны грузапаток

Гарэньне буксаў, дрэнная праца вагоннага парку і абменнага пункту, адсутнасьць гаспадарчага разрахунку—тармазы на чыгуначных рэйках

Зьнішчыць іх — справа комсамолу

Дзеньнік работы выязной рэдакцыі

Гомель

За першую декаду сьнежня заданьне па карыснай працы таварага вагона выканана толькі на 8,6 проц. Ваген, замест 7 гадзін 45 хвілін працуе 6 г. 6 хвілін.

Заданьне па маршрутызацыі так амаль выканана.

Алгавебным невыкананьні заданьня гаспадарчасьць чыгункі даецца толькі тады, калі аб гэтым піша „Палескам праўда", або „На соцыялістычных рэйках" таму што партыйна-комсамольскія і профэсыйныя організацыі недастаткова мобілізуюць масы чыгуначнікаў на ліквідацыю прарываў.

Отройка гаркому ЛКСМБ сумес на з выязной рэдакцыяй „Чырвонай зьмены" дапамаглі комсамольскаму колектыву перабудаваць сваю працу па-новаму, і гэта дасьць магчымасьць хутчэй ліквідаваць прарыў.

Пакуль што толькі 2 комсамольскія паравозы і паравоз С—272 спаравых брыгад Крычатоўскага і Жэбелева, уключыўшыся ва ўсесаюзнае спаборніцтва спаравых брыгад, абгаварваюць у сваіх брыгадах на сваім паравозе ўсе свае недахопы і дасягненьні.

Надзвычай дрэнна ладзіцца пераход ударных брыгад на гаспадарчы разрахунак, на заводзе імя Ланцуцкага.

Некаторыя комсамольцы не ведаюць яшчэ, што такое гаспадарчы разрахунак, як конкрэтна організаваць гаспадарча-разрахунковую брыгаду.

Гэтымі днямі па ініцыятыве выязной рэдакцыі комсамольскага колектыву, была склікана нарада інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу сумесна з брыгадзірамі гаспадарча-разрахунковых брыгад. Нарада распрацавала конкрэтныя формы пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Пачатак ёсьць. Зараз патрэбна перавесьці на гаспадарчы разрахунак усе комсамольскія і маладзёжныя брыгады.

Гэта лепшы падарунак IV пленуму ЦК ЛКСМ

Выязная рэдакцыя „Чырвонай зьмены"

БУКСЫ ГАРАЦЬ— з дымам уходзяць тысячы рублёў

Прычын асабліва шукаць ня прыходзіцца, іх багата. Яны крыюцца ў нядбайных адносінах кандуктарскіх брыгад і змазчыкаў да свае работы, у дрэнным аглядзе вагонаў на станцыі адпраўленьня. Яны крыюцца ў абязьлічцы змазачных работ, ва ўраўнілаўцы, якая пануе яшчэ на паасобных вучастках транспорту.

Так,—шукаць ня прыходзіцца.

Вось, уявеце кандуктара або змазчыка, які заснуў на тармазох. Поезд на поўным хаду. Задыміліся буксы. Ніхто не аглядае, ніхто не правярае стан змазкі. На поўляху астаноўка, на бліжэйшай станцыі адчэпка, а разам з гэтым і прастой вагонаў, прастой грузоў, прастой і пробка на вузлах.

А разам з гэтым новыя выдаткі на пагрузку грузаў на паўторныя рамонты і знашваньне вагоннага парку.

Прычын шукаць ня прыходзіцца. Яны надзвычай яскрава выяўляюцца, калі мы паглядзім на лічбы. Аб многім сьведчаць гэтыя лічбы.

У верасьні 1930 году на 9-м вучастку Гомель было 38 адцэпак, у кастрычніку 73, у лістападзе 88.

Сёлета адчэпка дасягнула „рэкордных" паказчыкаў. Верасень даў 137 выпадкаў, кастрычнік 151, а лістапад 191.

Зьвернемся да другога раёну. Тут некалькі іншы стан. На станцыі Ласьвіда (Віцебскага раёну) за кастрычнік месяц было адчэплена 21 вагон, у лістападзе 18 вагонаў і ў сьнежні за першыя 20 дзён 18 вагонаў.

Буксы гараць. З дымам уходзяць тысячы рублёў, выбываюць са строю дзясяткі і сотні вагонаў, парушаецца нормальны паток грузаў, ствараюцца цяжкасьці ў асеньня зімовых.

На парадак дня комсамольскай організацыі транспорту—барацьбу з адчэпкамі вагонаў. Буксы не павінны гарэць. За кожны вагон, што выбыў са строю, адказвае комсамольская організацыя вузла і павінен адказваць кожны комсамолец, які пастаўлен на гэты вучастак.

Асеньня-зімовыя перавозкі, зьвязаныя са сьнегавымі заносамі і вялікім патокам грузаў, не павінны затрымліваццa з-за няспраўнасьці вагонаў і буксаў.

Ганаровай задачай комсамольскай організацыі ў дні ўсесаюзнага сталінскага паходу павінна быць канчатковая ліквідацыя ўраўнілаўкі ў сыстэме аплаты рабочых транспорту, барацьба за сапраўдную ліквідацыю абязьлічкі, за тое, каб давесьці да нуля выпадкі вываду вагонаў з цягнікоў і факты гарэньня букс.

Конкрэтнымі справамі даб'емся рэалізацыі гэтай задачы.

Буксы не павінны гарэць.

Апошнія дні зрабіць штурмавымі

Чацьверты год пяцігодкі сустрэць поўным выкананьнем плянаў збожжазагатовак

У асобных раёнах, як Стара-Дароскі, Мазырскі, Петрыкаўскі, Тураўскі выкананьне пляну ганебна зрываецца. У гэтых раёнах комсамольская організацыя яшчэ ня выступіла на барацьбу за хлеб. Сёньня адчыняецца пленум ЦК ЛКСМБ Мы гэты факт асабліва падкрэсьліваем і патрабуем ад сэкратароў райкомаў КСМ гэтых раёнаў прыняць самыя безадкладныя захады, каб ліквідаваць сваё адставаньне.

Да 1 студзеня на фронце збожжазагатовак павінна быць перамога. Комсамолія ў гэтыя рашаючыя дні павінна паказаць, што яна можа па-баявому штурмаваць прарывы і кінуць усе сілы на пасьпяховае сканчэньне збожжазагатоўчай кампаніі.

Не здаваць позыцыі

Тэмпы збожжазагатовак павінны нарастаць

За апошнюю дэкаду ў Слуцкім р-не наглядаецца зьніжэньне тэмпаў у барацьбе за хлеб, за выкананьне пляну (усяго4 проц. павялічэньня).

Ганебна плятуцца ў хвасьце загатовак, зьніжаючы агульна-раённы плян, наступныя с-саветы: Цараўскі—выканаў плян на 45 проц., Вяліка-Слуцк—на 36,1 проц., Палікарпаўскі—44,4 проц., Сераскі—на 45,1 пр. Організацыі гэтых сельсаветаў, замест разгарнуць політычна-масавую работу вакол гэтай кампаніі, займаюцца опортуністычнымі разважаньнямі аб нерэальнасьці плянаў. У гэтых с-саветах недастаткова рашуча вядзецца барацьба з месьніцкімі настроямі ў колгасах і кулацкім сабатажам.

Недапушчальна павольнымі тэмпамі ідуць збожжазагатоўкі ў індывідуальным сэктары. У той час як колгасы ўжо перавыканалі плян, аднаасобнікі здалі 46,1 проц. Прычынай гэтаму недастатковая работа сярод аднаасобнага сэктару і бязьдзейнасьць райкоопсаюзу, які нават не мобілізаваў сваіх прадстаўнікоў на загатоўкі. Апарат райколгассаюзу ў апошні час ператварыўся ў казённага, мэханічнага прыёмшчыка збожжа.

Раённыя організацыі, правёўшы вялікую работу ў час штурмавога дэкадніка, на гэтым супакоіліся. Штурм не працягваецца да поўнай перамогі.

Брыгадзір „ЧЗ" Канончык Я.



Ня ведаюць аб сваіх абавязках

Збожжазагатоўкі ў Балатнянскім сельсавеце, Карминскага раёну праходзяць нездавальняюча. Колгасны сэктар зусім адстае, выканаўшы плян на 15 проц. Сельсавет ніякай работы сярод колгасьнікаў не праводзіць. Бязьдзейнічае таксама і комсамольская ячэйка пры сельсавеце. Комсамольцы нават ня ведаюць аб тым, што іхная справа —змагацца за плян збожжазагатовак.

Г-ка.

ЗА ЛЕНІНСКІ СТЫЛЬ РАБОТЫ

З ПАСТАНОВЫ аб'яднанага пленуму Менгаркому і ГарКК КП(б)Б ад 14-17-XI-31 г.

Па дакляду т. Янковіча аб рабоце Менскай КСМ організацыі і ўдакладу т. Грыцкевіча аб становішчы парткіраўніцтва комсамолам

Зьмешчаная пастанова аб'яднанага пленуму Менгаркому і ГарКК КП(б)Б па дакладу аб становішчы і рабоце Менскай комсамольскай організацыі заслугоўвае надзвычайна вялікай увагі.

Аб'яднаны пленум, глыбока аналізуючы становішча работы комсамольскай організацыі, разам з паказам станоўчых прыкладаў, з усёй рашучасьцю адзначае недахопы і мобілізуе ўвагу партыйнай і комсамольскай організацыі на безадкладнае выпраўленьне іх.

Толькі ўвага партыйнай організацыі, палепшаньне партыйнага кіраўніцтва комсамолам асабліва ў справе замацаваньня навічкоў, узброеньне комсамольцаў ленінскім стылем забясьпечаць рашаючымі посьпехамі работу комсамольскіх організацый на ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва.

Менская КСМ організацыя, пад непасрэдным, выпрабаваным кіраўніцтвам КП(б)Б змагаючыся за ажыцьцяўленьне рашэньняў партыі і КСМ зьездаў, за ператварэньне КСМ організацыі ў шматмільённую, дабілася карэннага палепшаньня ў справе ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве і ў значнай меры ўзмацніла работу ў ліне нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Праводзячы ўсю сваю дзейнасьць на аснове жорсткай бязьлітаснай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць правага опортунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, „левых" загібаў, рэштак контррэволюцыйнага троцкізму і прымірэнцтва да іх, а таксама супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, беларускага контррэволюцыйнага нац.-дэмократызму, нацыянал-опортунізму і інш. мясцовых шовінізмаў, змагаючыся за прынцыповую чыстату ленінскай нацыянальнай політыкі партыі—Менская КСМ організацыя ідэёва вырасла, значна загартавалася, зьяўляючыся сапраўды верным баявым дапаможнікам партыі.

Пленум прызнае політычную лінію Гарадзкога камітэту ЛКСМБ правільнай і ў практычнай працы Менскай КСМ організацыі адзначае наступныя посьпехі:

1. Якаснае палепшаньне работы КСМ організацыі ў прамысловасьці:

а) ахоп соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам 92,1 проц. КСМ організацыі (з ліку 8210 вытворчай часткі організацыі—7565 ударнікаў), укараненьне гаспадарчага разрахунку: створана 118 маладзёжных гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія даюць лепшыя прыклады перавыкананьня прамфінпляну, дзесяткі тысяч рублёў экономіі („Бальшавік", „Варашылава", абутковая, „Кастрычнік", „ДА", „Усход" і інш.).

Уцягненьне комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў плянаваньне вытворчасьці. Организавана 106 плянава-опэрацыйных груп з ахопам 913 комсамольцаў. Ужываньне ў організацыі комуністычных формі мэтодаў працы (конвэер якасьці, самакантроль, буксір адстаючым, дзесяціхвілінныя паміж зьменныя вытворчыя нарады) з пераключэньнем іх на вышэйшую ступень соцспаборніцтва.

б) Значна палепшылася праца КСМ організацыі ў пытаньнях барацьбы за выкананьне фінпляну.

2. Наяўнасьці посьпехаў КСМ організацыі ў справе разгортваньня сеткі вышэйшых і сярэдніх навучальных установаў, пролетарызацыі іх, мобілізацыі мас комсамольцаў на барацьбу за партыйнасьць у навуцы, супроць ідэалістычна-меншавіцкіх, мэханістычных плыняў, павялічэньне ролі КСМ у рэконструкцыі ВНТУ, ВНУ, тэхнікумаў і ФЗВ, значнае палепшэньне непасрэднага ўдзелу КСМ у стварэньні вялікага мастацтва бальшавізму, заклік ударнікаў у літаратуру і мастацтва.

3. У галіне практычнага вырашэньня задач росту КСМ Менская організацыя, асабліва на працягу апошняга паўгодзьдзя, дасягнула буйных посьпехаў:

а) за 11 месяцаў 1931 г. організацыяй прынята ў КСМ—8615 чал. Па раду важнейшых вядучых галін прамысловасьці ў асноўным завершана задача стопрацэнтнага ахопу рабочай моладзі КСМ (машынабудаўнічыя—92 проц., транспарт 89 проц.), прычым агульны процант ахопу рабочае моладзі прамысловасьці гораду складае 74 проц.)

4. Пленум адзначае наяўнасьць посьпехаў у перабудове сыстэмы саюзнай работы з пункту погляду пераносу цэнтру цяжару яе ў нізавое зьвяно організацыі. Комсамольская група, брыгада на радзе прадпрыемстваў стала асноўным вядучым зьвяном у рабоце КСМ на вытворчасьці.

Адзначаючы гэтыя дасягненьні, пленум з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае наяўнасьць у рабоце організацыі наступных недахопаў:

1. У значнай частцы КСМ організацыі гораду і асабліва вёскі перабудова саюзнай работы прашла недастаткова. Зусім нездавальняюча пастаўлена работа па замацаваньню навічка-комсамольца.

Пленум констатуе наяўнасьць значнага прарыву ў вясковай частцы організацыі, асабліва ў галіне ўдзелу КСМ у організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў.

2. Сучасны стан політвучобы ў КСМ організацыі Менску пленум лічыць зусім нездавальняючым.

3 Недастаткова разгортваецца ініцыятыва і практычная работа па вывучэньню беларускае мовы, гісторыі і эконокміі БССР. Амаль адсутнічае работа сярод рабочай і працоўнай моладзі нацменшасьцяй.

Выходзячы з гэтага пленум прапануе.

1. Узьняць на яшчэ больш прынцыповую вышыню клясавую пільнасьць КСМ організацыі, бязьлітасна змагаючыся за генэральную лінію партыі на ўсіх фронтох соцыялістычнага будаўніцтва, супроць правага опортунізму, як галоўнай небясьпекі і „левых" загібаў, супроць рэштак контррэволюцыйнага троцкізму, супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі ў галіне нацыянальнага пытаньня, супроць контррэволюцыйнага нацдэмократызму, нацыянал-опортунізму і іншых мясцовых шовінізмаў і прымірэнцтва да іх,—узьняўшы гэтым самым на больш высокую ступень ідэйна-бальшавіцкае выхаваньне. КСМ організацыі і згуртаванасьць яе вакол комуністычнае партыі.

Надаючы выключна важнае значэньне распрацоўцы сустрэчных плянаў на 1932 год, шырока распаўсюдзіць вопыт працы плянава-опэрацыйных груп, палепшыць якасьць іх работы.

Пленум абавязвае ўсе гаспадарчыя і профорганізацыі аказаць усямерную матэр'яльна-тэхнічную дапамогу у справе шырокага разьвіцьця і якаснага замацаваньня плянава-опэрацыйных груп на вытворчасьці.

Адзначаючы наяўнасьць недахопаў у сыстэме партыйнага кіраўніцтва КСМ організацыі (нізкі процант партасяродку), адсутнасьць з ім работы і інш., пленум лічыць, што выкананьне важнейшых задач, пастаўленых перад комсамолам, патрабуе значнага палепшаньня ўсёй сыстэмы партыйнага кіраўніцтва комсамолам. Пленум прапануе:

а) усім партколектывам і ячэйкам увесьці ў сыстэму работы плянавае сыстэматычнае абгаварэньне раду пытаньняў практычнай дзейнасьці комсамолу.

Паставіць важнейшай задачай павялічэньне проценту партыйнага асяродку ў КСМ, асабліва на вытворчасьці.

г) прапанаваць партколектывам і ячэйкам неадкладна праглядзець склад інстытуту партпрымацаваных, праверыўшы іх работу па кіраўніцтву і дапамозе КСМ. Рашуча ліквідаваць практыку, якая яшчэ наглядаецца вылучаць для работы ў КСМ бязьдзейных „парт. палаш". Неабходна вылучаць вытрыманых, падрыхтаваных комуністых, увёўшы ў сыстэму праверку і кіраўніцтва іх работай.

Аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

1. КП(б)Б, на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і яе неадрыўнай часткі—ленінскай нацыянальнай політыкі, у барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага контр-рэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, шовінізму іншых нацыянальнасьцяй і нацыянал-опортуністычнай агентуры ў радох партыі, дасягнула велізарных посьпехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Дзякуючы брацкай дапамозе пролетарыяту СССР, шырокімі тэмпамі (пераўвышаючымі агульнасаюзныя) разгортваецца прамысловасьць БССР (пабудован рад новых буйных прадпрыемстваў: Гомсельмаш, Асінбуд, ф-ка штучнага валакна і інш.), што значна павялічыла рады пролетарыяту і павысіла вядучую ролю прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР. КП(б)Б дасягнула рашаючых посьпехаў і ў справе соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі (колектывізацыя 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, павялічэньне пасеўных плошчаў, асабліва пад тэхнічнымі культурамі, узмацненьне і рост саўгасаў, асабліва спэцыялізаваных жывёлагадоўчых і інш.)

Велізарны размах культурнай рэволюцыі, увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня, посьпехі ў ліквідацыі няпісьменнасьці, буйны рост сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў, значнае павялічэньне пролетарскай праслойкі ў гэтых установах, посьпехі мастацтва БССР, абслугоўваньне нацменшасьцяй на роднай мове,—усё гэта сьведчыць аб тым, што КП(б)Б з посьпехам выконвае задачу ліквідацыі эконамічнай і культурнай адсталасьці БССР.

2. ЦК констатуе, што, ня гледзячы на неаднакратныя ўказаньні ЦК КП(б)Б аб узмацненьні барацьбы з ухіламі у бок вялікадзяржаўнага шовінізму, ў радзе зьвеньняў партыйнай арганізацыі, гэта задача не знайшла неабходнага адлюстраваньня і нават у радзе месц ёсьць выпадк, аслабленьня барацьбы з вялікадзяржаўным шовінізмам. Рад вылазак вялікадзяржаўнага шовінізму не сустракаюць патрэбнага адпору з боку асобных нізавых парторганізацый. Не пастаўлена сыстэматычная барацьба з прымірэнчымі адносінамі да ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шовінізму. Навуковыя таварыствы і гурткі праявілі пасыўныя адносіны да задачы мобілізацыі тэорэтычнай думкі партыі на барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам.

3. Актывізацыя ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шовінізму за апошні час праявілася ў радзе вылазак. Адной з такіх вылазак зьявіліся выступленьні групы вучоных і літаратараў (Вольфсон, Выдра і інш.), якія выходзячы з крытыкі нацыянал-дэмократызму не з марксісцка-ленінскай пастаноўкі нацыянальнага пытаньня, а з позыцый вялікадзяржаўных ухілістых (процістаўленьне нацыянальнай формы культуры яе пролетарскаму зьместу, развагі аб перабольшваньні „асаблівасьцяй" беларускай нацыі, насьмешлівыя і пагардлівыя адносіны да раду „дробязяй" нацыянальнай культуры, быту і г. д.)

Праяўленьнем вялікадзяржаўнага ўхілу зьяўляецца падзел асобнымі гісторыкамі-марксыстамі (Югаў) камуністаў на вялікарускіх, з аднаго боку, і беларускіх, украінскіх і г. д.— з другога боку, што стварала антагонізм і прывяло да пагардлівых, нетаварыскіх адносін да асобных беларускіх работнікаў.

Аслабленьне работы па беларусізацыі, якое наглядаецца то ў адной, то ў другой партыйнай арганізацыі, на што ЦК КП(б)Б прыходзілася не раз указваць. (Віцебск і інш.) зьяўляецца вынікам недаацэнкі нацыянальнага пытаньня і прымірэнчых адносін да ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шовінізму.

Выходзячы з гэтага, ЦК КП(б)Б лічыць першачарговай задачай усёй КП(б)Б—павысіць пільнасьць да вылазак і праяўленьняў вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і арганізаваць яшчэ больш актыўную барацьбу з ім, наносячы рашучы ўдар па опортуністычным і абывацельскім прымірэнцтве да вялікадзяржаўнага ўхілу.

4. Барацьба супроць беларускага нацыянал-дэмократызму і нацыянал-опортунізму вялася, вядзецца і будзе праводзіцца ўсёй КП(б)Б з бальшавіцкай цьвёрдасьцю і настойлівасьцю. Разгортваньне бальшавіцкім тэмпам соцыялістычнага будаўніцтва і значныя посьпехі, дасягнутыя КП(б)Б у індустрыялізацыі і соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі былі немагчымы без рашучай барацьбы КП(б)Б з усімі праяўленьнямі опортунізму і шовінізму у тым ліку без пасьлядоўнай барацьбы з беларускім нацыянал-дэмократызмам і яго нацыянал-опортуністычнай агентурай у радох партыі.

Адначасова ЦК лічыць, што прыняты у радзе кіруючых артыкулаў, зацьверджаных ЦК ў 1929 г. і пачатку 1930 г. а таксама прыняты у пастановах XIII зьезду КП(б)Б па дакладу аб профсаюзах лёзунг аб тым, што нацыянал-дэмократызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, зьяўляўся памылковым лёзунгам. Такая пастаноўка пытаньня супярэчыла пастановамXI зьезду РКП(б) і XVI зьезду УсеКП(б), У поўнай адпаведнасьці з пастановамі і указаньнямі XVI зьезду УсеКП(б), КП(б)Б бясспрэчна і пасьля зьезду прыняла устаноўку аб тым, што галоўнай небясьпекай на даным этапе прадстаўляе вялікадзяржаўны ўхіл, які імкнецца рэвізаваць асновы ленінскай нац. політыкі і пад сьцягам інтэрнацыяналізму, прыкрываючы імкненьні адміраючых клясаў панаваўшай раней вялікадзяржаўнай нацыі, вярнуць сабе страчаныя прывілеі" (XVI зьезд УсеКП(б).

5. Наяўнасьць на вызначаным этапе няправільнага лёзунгу аб тым, што нацыянал-дэмократызм зьяўляецца галоўнай небясьпекай, не дае ніякіх падстаў прыніжаваць праводзімую КП(б)Б барацьбу з нацыянал-дэмократызмам і нацыянал-опортунізмам. Выкрываньне і барацьба супроць нацыянал-дэмократызму і яго агентуры ў радох партыі—нацыянал-опортунізму была праведзена кампартыяй Беларусі усім пры вільнай.

ЦК заклікае ўсе парторганізацыі КП(б)Б даць бязьлітасны адпор усялякім спробам перагледзець, або ахаяць політыку партыі ў барацьбе з нацыянал-дэмократызмам і нацыянал-опортунізмам. Пасьлядоўная і непрымірымая барацьба супроць нацыянал-дамократызму і нацыянал-опортунізму складае і надалей важнейшую задачу ўсёй КП(б)Б.

Памылковасьць лёзунгу аб нацыянал-дэмократызьме, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, заключалася у тым, што гэты лёзунг не концэнтраваў галоўнага агню супроць вялікадзяржаўнага ўхілу і тым самым не садзейнічаў неабходнай мобілізацыі партыйных сіл на барацьбу з ім.

6. ЦК КП(б)Б заклікае мясцовыя парторганізацыі да большай пільнасьці і ў адносінах ўхілу у бок мясцовага (беларускага, польскага, яўрэйскага і інш.) шовінізму. Нацыянал-дэмократызм і нацыянал-опортунізм ў выніку пасьлядоўнай барацьбы КП(б)Б нацярпелі жорсткае паражэньне, але ня зьнішчаны. Работа нацыянал-дэмократычных элемэнтаў і цяпер працягваецца.

Разьбіты і скомпромэтаваны ў вачох шырокіх мас працоўных контррэволюцыйны нацыянал-дэмократызм будзе выяўляцца як у старых, так і ў новых некалькі іншых формах. Гэта патрабуе далейшага ўзмацненьня пільнасьці з боку ўсёй КП(б)Б да ўсялякіх праяўленьняў у радох партыі ўхілу ў бок мясцовага беларускага шовінізму.

„Сутнасьць ухілу да мясцовага нацыяналізму заключаецца ў імкненьні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай шкарлупы, у імкненьні затушаваць клясавыя супярэчнасьці ўнутры сваёй нацыі, у імкненьні абараніцца ад вялікарускага шовінізму, шляхам адыходу ад агульнага патоку соцыялістычнага будаўніцтва, у імкненьні ня бачыць таго, што зьбліжае і злучае працоўныя масы нацыянальнасьцяй СССР і бачыць толькі тое, што можа іх аддаліць адну ад другой" (Сталін).

Адной з форм праяўленьняў ухілу ў бок мясцовага шовінізму зьяўляецца падыход да нацыянальных кадраў бяз уліку ідэолёгічнай вытрыманасьці і соцыяльнага складу гэтых кадраў, забываючы і затушоўваючы тое, што адзіным крытэрыем для ацэнкі комуністага зьяўляецца ступень яго партыйнай вытрыманасьці і здольнасьць на справе ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

7. ЦК зварачае сур'ёзную ўвагу ўсёй КП(б)Б на неабходнасьць значнага ўзмацненьня справы падбору і ўцягненьня ў кіруючую партработу партыйна-вытрыманых кадраў беларускіх работнікаў і іх выхаваньне ў духу бальшавіцкай непрымірлівасьці да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. „Апіраючыся на посьпехі прамысловага будаўніцтва, партія павінна шырока разгарнуць вылучэньне рабочых на партыйную, савецкую і гаспадарчую работу, аб'ядноўваючы гэта вылучэньне з выхаваньнем і падрыхтоўкай новых кадраў" (кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б, 1930 г.) Пры гэтым неабходна, раўна з уважлівымі, беражлівымі адносінамі да комуністычных кадраў КП(б)Б, разгортваць бальшавіцкую самакрытыку, рашуча выцягваючы памылкі і скажэньні генэральнай лініі партыі, а таксама вядучы барацьбу супроць конкрэтных носьбітаў вялікадзяржаўнага і мясцовага шовінізмаў.

8. КП(б)Б і далей будзе бязьлітасна змагацца супроць недаацэнкі работы сярод нацыянальных меншасьцяй (палякаў, яўрэяў і інш.), супроць антысэмітызму і ігнараваньня работы сярод працоўных палякаў. Разгортваньне і далейшае ўзмацненьне работы сярод нацыянальных меншасьцяй БССР зьяўляецца неадрыўнай часткай барацьбы за ленінскае вырашэньне нацыянальнага пытаньня. ЦК патрабуе ад усіх парторганізацый сапраўднага палепшаньня культурна-эконамічнага абслугоўваньня працоўных нацменшасьцяй, даючы бязьлітасны адпор імкненьням клерыкальных і шовіністычных элемэнтаў разбурыць адзінства працоўных розных нацыянальнасьцяй, памятаючы, што толькі ўважлівымі адносінамі да штодзенных патрэб нацыянальных меншасьцяй можна яшчэ ў большай ступені актывізаваць іх удзел у агульным соцыялістычным будаўніцтве.

9. Выходзячы з вышэй азначанага, ЦК ставіць перад усёй КП(б)Б наступныя практычныя задачы:

а) неаслабна праводзіць політыку беларусізацыі, прымаючы рашучыя меры ўзьдзеяньня ў адносінах да тых кіруючых нізавых раённых і цэнтральных работнікаў, якія ігнаруюць беларусізацыю і асабліва не вывучаюць беларускай мовы;

б) далейшае растлумачэньне шырокім масам працоўных, у першую чаргу пролетарскім масам, значэньня праводзімай КП(б)Б беларусізацыі, разгортваючы ўпартую сыстэматычную работу па беларусізацыі рабочай клясы з улікам усіх умоў, азначаных пастановай кастрычніцкага (1930 г.) пленуму ЦК КП(б)Б;

в) праводзеньне неаслабнага змаганьня з антыленінскай тэорыяй барацьбы дзьвёх культур як у не вялікадзяржаўна-расійскай, так і беларускай разнавіднасьці, ЦК папярэджвае, што абмежаваньне задач па беларусізацыі адным толькі вывучэньнем беларускай мовы зьяўляецца недаацэнкай нацыянальнага пытаньня і што справа сапраўднага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі заключаецца ў аўладаньні парторганізацыяй і рабочай клясай усімі процэсамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва (тэорэтычны фронт, мастацкая літаратура і творчасьць, агульны фронт мастацтва). Толькі пры гэтых умовах можа быць забясьпечана сапраўднае пролетарскае кіраўніцтва нацыянальна-культурным будаўніцтвам.

г) Узмацненьне ўвагі да пытаньняў разьвіцьця вышэйшых форм беларускай культуры—нацыянальнай па форме, пролетарскай па зьместу (літаратуры, тэатр, кіно, музыка), дасканалае вывучэньне процэсаў, якія адбываюцца ў гэтай галіне, з мэтай далейшага ўзмацненьня пролетарскага кіраўніцтва гэтымі процэсамі і больш поўнага адлюстраваньня сучаснага этапу соцыялістычнага будаўніцтва ў розных галінах мастацтва, паказ ударнікаў у літаратуры, тэатры, кіно і г.д.;

д) узмацненьне спэцыяльнай увагі да сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў БССР з мэтай палепшыць падрыхтоўку маладых кадраў пролетарскай нацыянальнай інтэлігэнцыі, ужыўшы таксама захады да правільнага падбору і ўзмацненьня падрыхтоўкі выкладчыцкага пэрсоналу, здольнага выканаць акрэсьленыя задачы. ЦК даручае культпропу ЦК і Наркомасьветы прыняць неабходныя мерапрыемствы да палепшаньня работы Комвузу імя Леніна. Інстытуту гісторыі партыі і Акадэміі Навук БССР і ўзмацненьня іх ролі ў справе падрыхтоўкі клясава-вытрыманых навуковых кадраў;

е) даручыць нацкамісіі ЦВК і культпропу ЦК распрацаваць практычныя мерапрыемствы па ўзмацненьню работы ў галіне беларусізацыі сярод рабочых і ва ўсіх установах, ужыўшы крокі да самай шырокай популярызацыі чарговых задач нацыянальнай політыкі КП(б)Б (на сходах, у гуртках, партшколах і г. д.).

10. ЦК падкрэсьлівае, што правільнае змаганьне за практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі можа з посьпехам праводзіцца толькі на аснове далейшага разгортваньня бязьлітаснай барацьбы супроць вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага шовінізму і контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму, шовінізмаў розных колераў і адценьняў і нацыянал-опортуністычнай агентуры ў радох партыі, толькі на аснове аўладаньня і кіраўніцтва з боку партыі і пролетарыяту ўсімі процэсамі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, няўхільна змагаючыся за чыстату генэральнай лініі партыі, даючы рашучы адпор праваму ўхілу—найбольш небясьпечнаму на даным этапе, яго „левым" саюзьнікам і прымірэнцтву да ўхілаў БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б і УсеКП(б) і пры брацкай дапамозе пролетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу дасягае новых, яшчэ большых посьпехаў у справе соцыялістычнага будаўніцтва.

СЁНЬНЯ, А 6-й ГАДЗІНЕ УВЕЧАРЫ,

у памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі (Комсамольская, 25)

АДЧЫНЯЕЦЦА

ЧАРГОВЫ 4 ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

НА ПАРАДКУ ДНЯ ПЛЕНУМУ

ДАКЛАД генэральнага сэкратара ЦК ЛКСМБ т. ПАЛЯКОВА

аб рэалізацыі рашэньняў Пленуму ЦК УсеЛКСМ аб рабоце з актывам і конкрэтным кіраўніцтве

На Пленум ЦК ЛКСМБ выклікаюцца, акрамя членаў і кандыдатаў ЦК і рэвіз. камісіі, сэкратары РК КСМ тых раёнаў, дзе ў гэты час не праводзіцца парткопфэрэнцыя.

Капіталістычная Польшча задыхаецца ў ціскох крызіса

1932 год нясе галодную сьмерць для новых соцень тысяч рабочых Польшчы

Газэта „Колёнія" піша, што пасьля новага году ў В. Сілезіі [...] дуць вялікія звальненьні рабочых з прычыны таго, што фабрыка[...] рыхтуюцца закрываць рэшту сваіх фабрык.

29 гэтага месяца будзе зачынена гута „Лазар" у Радзін[...] Апрача гэтага, маюць быць зачынены ўсе аддзелы гуты „Форум". [...]канцы „Колёнія" з вялікім пэсымізмам піша аб гаспадарчым стан[...] шчы Польшчы: „Гаснуць печы, з кожным днём замыкаюцца фабр[...] замыкаюцца брамы фабрычныя... Скрозь пуста і глуха... А на [...]пах гарадоў сотні і тысячы галодных беспрацоўных, якія асуджа[...] на павольнае ўміраньне"


* * *

У сувязі са звальненьнем некалькіх дзесяткаў рабочых і служач[...] з крам і магазынаў фірмы „Бр. Гіршдэльд". у Варшаве выбухла [...] бастоўка. Гэтымі днямі адбылася дэмонстрацыя, у часе якое ў не[...]торых магазынах павыбіваны шыбы. выламаны дзьверы і зьнішч[...] тавары. Поліцыя дэмонстрацыю разагнала. Па ўсіх крамах і магаз[...]нах цяпер пастаўлены патрулі.

* * *

Газэты паведамляюць, што ў апошні час па ўсёй Лодзінскай пра[...]мысловасьці пачынаюцца масавыя звальненьні рабочых у сувязі [...] зачыненьнем фабрык. На днях фабрыка І. К. Пазнанскага ў Лодзі [...]чынілася. Некалькі сот рабочых без працы.

Паводле фашысцкай статыстыкі, у Польшчы рост беспрацоўя [...] спыняецца. У даны момант налічваецца па ўсёй Польшчы 274,2[...] беспрацоўных. У параўнаньні з мінулым тыднем, беспрацоўе ўзрасло на 5081 чал. Гэтая лічба далёка ня поўная. Сапраўдная колькасць беспрацоўных ужо находзіцца каля 300 тысяч, ня лічачы іх сем'яў.



Дэмонстрацыя нямецкіх комсамольцаў

Новыя сотні шпікаў для задушэньня рэволюцыйнага руху

„Газэта адміністрацыі поліцыі і дзяржаўнай" паведамляе, што ўсе поліцыянты, якія скончылі сьледчыя курсы у лістападзе г. г., будуць пераведзены з умондыраваных поліцэйскіх на шпікаў. Такім чынам лік шпікаў павялічыцца яшчэ на 500 асоб. Усе новапрызначаныя шпікі будуць рассылацца [...] вясковых поліцэйскіх пастарунках.

Фашысцкі ўрад у сувязі з вя[...]ростам рэволюцыйнага руху пра[...]нага сялянства, пасылае новыя [...] поліцэйскіх груганоў для задушэ[...] рэволюцыйнага руху.

Адбілі арыштаванага з рук поліцыі

Як паведамляе „Слова", на днях у Вільні поліцыянт арыштаваў падазронага яму чалавека, якога хацеў завесьці у дэфэнзыву. Калі ён вёў па вуліцы Міцкевіча, на поліцыянта напала некалькі асоб, якія адбілі арыштаванага.

Напады на поліцыю з мэтай адб[...] арыштаваных набываюць усё бо[...]шыя памеры.

Сяляне сякуць панскія лясы

Па ўсіх вёсках Заходняй Беларусі працоўнае сялянства масава выступае супроць абшарніцтва і кулацтва. Сяляне ня гледзячы на ўсе прывілеі для абшарнікаў ад фашысцкага ўраду сілай забіраюць сэрвітуры, сякуць абшарніцкі і дзяржаўны лес. На днях у Майштанскіх лясох пад Браслаўлем сяляне напалі на дзяржаўны лес[...] пачалі яго рубіць сабе на апал. Г[...] заўважыў лясьнік Паўловіч і хац[...] прагнаць сялян. Сяляне лясьнік[...]ловіча зьбілі і прагналі.

Адказны рэдактар Л. ПЭРЛІН

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2225.